ЗАЦВЯРЖДАЮ
Дырэктар установы адукацыі
“Магілёўскі дзяржаўны абласны ліцэй № 1”
_____________П.У. Шылаў
_____________2013 г.

Дата правядзення: 14 чэрвеня 2013.
Час выканання работы: 45 хвілін

# Кантрольны дыктант па беларускай мове для правядзення ўступнага экзамену ў 8 клас

## Кірыла Тураўскі

Кірыла Тураўскі − адзін з самых славутых пісьменнкаў старажытнай літаратуры. Ён нарадзіўся і жыў на Палессі, у горадзе Тураве. У той час было прынята дадаваць да імя славутых людзей назву таго месца, дзе яны нарадзіліся або жылі.

Паходзіў Тураўскі з даволі заможнай сям’і. Калі стаў дарослым, захацеў вучыцца і пайшоў у манастыр.

Так рабілі ўсе, хто цікавіўся кнігамі, бо кнігі ў той час былі ў асноўным царкоўныя. За гады жыцця ў манастыры пісьменнік праславіўся і як вучоны, і як чалавек незвычайнай маральнай чысціні. Тураўскі перасяліўся ў вежу, перанёс туды сваю бібліятэку і загадаў замураваць дзверы, каб не мець магчымасці выйсці. Некалькі гадоў ён правёў у малітвах, чытаў святыя кнігі і пісаў сам.

*Паводле У. Бутрамеева.* (111 слоў)